
В.Качан. “Забытыя фрэскі маёй памяці №1”.


В.Качан. “Нараджэнне кампазіцыі-2”.

# Адэкватнасць часу


В.Качан. З серыі “Туман”.

***15 чэрвеня ў лекцыйнай зале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылася прэзентацыя фотаальбома "Фатаграфіі мінулых гадоў". Аўтар прадстаўленых у гэтым альбоме-кнізе фотаздымкаў і тэкстаў — мінскі фотамастак, старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання "Фотамастацтва" Вадзім Качан.***

Свой творчы шлях, а дакладней, сваё прафесійнае ўзыходжанне ён пачаў, мабыць, з супрацоўніцтва ў межах фотаклуба пры рэдакцыі "Вячэрняга Мінска". Такія добра вядомыя зараз фотамайстры, як Андрэй Шчукін, Юрый Захараў Яўген Калюжны і іншыя, таксама выйшлі з гэтага асяродку.

Пачынаючы з 80-х гадоў, ён не выпускае са сваіх рук фотакамеру, актыўна ўдзельнічаючы ў шматлікіх праектах. Адзін з іх — найбольш значны— "Фотаманіфест. Сучасная фатаграфія ў СССР" 1991 года. У тым жа годзе — так распарадзіўся лёс — ён адыходзіць ад творчасці на даволі працяглы час. Сімвалічным жа знакам стала ягоная выстаўка "Асколкі" (галерэя "NOWA"). Пасля было шмат выставак у музеях, галерэях, бібліятэках Беларусі, Расіі, Украіны... Вярнуўшыся ў фотамастацтва з новымі сіламі, з новым разуменнем і асэнсаваннем працэсаў як у самім жыцці, так і ў мастацтве, Вадзім Качан, як сапраўдны творца, пачынае шукаць адэкватныя часу сродкі выяўлення. Адмовіцца ад тых тэхнічных магчымасцей, якія забяспечвае сучасная інфармацыйна-тэхналагічная культура, ён лічыць немэтазгодным. Выкарыстаць такія магчымасці — значыць моцна пашырыць палітру мастака, надаць большую вытанчанасць і глыбіню неадназначных сэнсаў яго творам.

Сучаснае фотамастацтва актыўна выкарыстоўвае камп'ютэрныя тэхналогіі. І Вадзім Качан не ў баку ад гэтых працэсаў. Камп'ютэр дапамагае яму ў стварэнні шэрага выдатных здымкаў з улюбёным кампазіцыйным прыёмам — прыёмам мантажу. Спектр жанравых пошукаў аўтара даволі шырокі — ад лірычных замалёвак беларускіх краявідаў, работ рэпартажнага плана да складаных кампазіцый з шырокімі асацыятыўнымі хадамі, сэнсам, што не ляжыць на паверхні, і адпаведнай ім пластыкай. Немалы жыццёвы досвед, прафесійнае чуццё і "божая іскра"-талент даюць магчымасць Вадзіму Качану ствараць такія адметныя і запамінальныя вобразы.

**Фёдар ЯСТРАБ**


В.Качан. “Перабудова”.


В.Качан. “Асацыяцыі”. Здымак 5.


В.Качан.
“Бабуля Вера. Лініі жыцця”.


В.Качан.
“Сон дзяўчыны напярэдадні вяселля”.